С37

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УО "БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ"

2016

# СОДРУЖЕСТВО НАУК. БАРАНОВИЧИ-2005

**МАТЕРИАЛЫ**

**МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ МОЛОДЫХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ**

**22 февраля 2005 г.**
**г. Барановичи, Беларусь**

**В 2 частях**
**Часть 2**

Библиотека БарГУ
0010 8849

**Барановичи 2005**

31122

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»
БИБЛИОТЕКА

УДК 082(043.2)
ББК 94
С 57

*Печатается по решению совета Учреждения образования "Барановичский государственный университет", протокол № 5 от 28.01.2005 г.*

Рецензенты: доктор педагогических наук, профессор УО "Белорусский государственный университет имени Максима Танка" Л.Д. Глазырина; кандидат юридических наук, доцент Киевского национального экономического университета Е.В. Перепадя (Украина); доктор педагогических наук, профессор, Резекненская Высшая школа Велта Любкина (Латвия); доктор технических наук, профессор УО "Брестский государственный технический университет" Ю.Н. Павлючук; кандидат технических наук УО "Брестский государственный технический университет" А.В. Драган

Редакционная коллегия: В.И. Кочурко (главный редактор), П.П. Шоцкий, В.Н. Зуев, Е.И. Пономарева, К.С. Тристень, В.В. Хитрюк, С.К. Рындевич, Н.М. Сотник, Е.И. Белая, Е.Г. Карапетова, Э.И. Дмитриченко, М. Ассад, В.В. Таруц, Т.Н. Рыбина, Г.Я. Житкевич, В.Л. Гурский, Е.Л. Малиновский, А.В. Трофимчик, И.Д. Высотенко, А.А. Ковалевская, Л.И. Кочкар

С57 **Содружество наук. Барановичи-2005:** Материалы междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, Барановичи, 22 февраля 2005 г.: В 2 ч. Ч. 2 / Редкол.: В.И. Кочурко (гл. ред.) и др.– Барановичи: УО "БарГУ", 2005.– 438 с.

ISBN 985-498-001-4
ISBN 985-498-003-0 (Часть 2)

В сборнике представлены статьи участников международной научно-практической конференции молодых исследователей "Содружество наук. Барановичи-2005", посвященные актуальным проблемам педагогики, психологии, методикам преподавания технических, экономических, юридических, гуманитарных наук.

Адресован студентам, аспирантам, учителям школ и преподавателям вузов, специалистам предприятий, организаций, учреждений соответствующего профиля.

ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ

**УДК 082(043.2)**
**ББК 94**

**ISBN 985-498-001-4**
**ISBN 985-498-003-0 (Часть 2)**

© УО "БарГУ", 2005

ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

**Литература**

1. Михайлов С.В., Полозова Т.Д. Воспитание творческого читателя: (Проб. внекл. и внешк. работы по лит.): Кн. для учителя. – М.: Просвещение, 1981.
2. Полозова Т.Д. Единство мысли, чувства и действия. – М., 1978.
3. Программы для учреждений, обеспечивающих получение общего среднего образования с русским языком с 12-летним сроком обучения. – М.: Национальный институт образования, 2004.
4. Бехер И.Р. Любовь моя, поэзия. О литературе и искусстве. – М., 1965.

## ДА ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ САЦЫЯЛЬНА-ГРАМАДЗЯНСКІХ КАМПЕТЭНЦЫЙ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРЫ

**Н.А. Губко**

Навуковы кіраўнік – А.І. Белая, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

УА "Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт", г. Баранавічы, Беларусь

Для канца ХХ – пачатку ХХІ стст. уласцівы змены ў характары навучання – у яго накіраванасці, мэтах, змесце – яно ўсё больш арыентавана на "свабоднае развіццё чалавека", на творчую ініцыятыву, самастойнасць навучэнцаў, вынікам чаго павінна стаць канкурэнтаздольнасць, мабільнасць будучых спецыялістаў [3].

Стратэгіі грамадзянскіх кампетэнцый з'яўляюцца асабліва актуальнымі для краін, якія знаходзяцца на этапе трансфармацыі, калі структуры грамадзянскага грамадства ў поўнай меры яшчэ не сфарміраваны, а працэс дэмакратызацыі ідзе супярэчліва. У такіх сітуацыях акцэнт на грамадзянскіх кампетэнцыях дае магчымасць развіваць сферу грамадзянскай адукацыі і рашаць задачы фарміравання грамадзяніна з дэмакратычным мысленнем. Да іх адносяцца [4]: веданне і выкананне правоў і абавязкаў грамадзяніна, свабода і адказнасць, упэўненасць у сабе, пачуццё асабістай годнасці, грамадзянскі абавязак, веданне дзяржаўных сімвалаў і гордасць за іх.

Спрыяльныя ўмовы для фарміравання грамадзянскіх кампетэнцый у працэсе навучання могуць быць створаны на ўроках беларускай літаратуры. Гэта абумоўлена спецыфікай зместу прадмета, а таксама магчымасцю выкарыстання спецыфічных метадаў, прыёмаў і відаў дзейнасці, такіх як работа ў групах, дыскусія, праекты, крытычная рэфлексія.

Літаратура не толькі раскрывае індывідуальны, непаўторны свет асобы, але і адлюстроўвае заканамернасці развіцця грамадства, рух чалавечай гісторыі, дае магчымасць актуалізаваць гістарычную памяць. У вучняў фарміруецца ўяўленне аб сувязі пакаленняў, аб гістарычным працэсе, што аказвае вялікі ўплыў на фарміраванне іх светапогляду. Асэнсоўваючы гістарычную пераемнасць дзейнасці беларускіх мысліцеляў, асветнікаў, пісьменнікаў, вучні глыбей спасцігаюць гістарычную місію свайго пакалення, перажываюць пачуццё далучанасці да сацыяльнай творчасці. Выдзяленне такіх адукацыйных аб'ектаў, як мастацкая канцэпцыя айчыннай гісторыі, нацыянальны характар як эстэтычная з'ява, вобраз героя як сінтэз канкрэтна-гістарычнага, канкрэтна-нацыянальнага і агульначалавечага, спрыяе фарміраванню эстэтычнага ўспрымання з'яў рэчаіснасці і пераводу яго ў каштоўнаснае. Дасягненне гэтых мэт магчыма пры адпаведнай арганізацыі працэсу літаратурнай адукацыі. Дбаючы пра фарміраванне грамадзянскай пазіцыі школьнікаў (а менавіта яна – аснова грамадзянскіх кампетэнцый), неабходна звяртаць іх увагу на карціны мастацкага часу ў творы, масавыя сцэны, у часе аналізу якіх трэба ажыццяўляць апору на ўласны вопыт навучэнцаў, арыентаваць іх на навыкі фарміравання і абароны ўласнага меркавання, развіваць крытычныя адносіны да сацыяльных з'яў і здольнасць дасягаць пастаўленых мэт, вырашаць праблемныя сітуацыі.

Працуючы над мастацкім тэкстам, неабходна памятаць наступнае:

– школьнікі ўзнімуцца да больш поўнага асэнсавання законаў грамадства, калі не толькі ўбачаць карціну жыцця ў творы, але і зразумеюць ацэнку гэтай карціны пісьменнікам;

– уменне ўспрымаць сістэму вобразаў твора павінна выступаць умовай глыбокага спасціжэння сацыяльна-маральных узаемаадносін герояў у творы. Гэта важна, бо ў школьнікаў фарміруюцца сацыяльныя пачуцці, папаўняецца вопыт адэкватных грамадзянскіх зносін;

– толькі ўсебаковы, цэласны аналіз асобы станоўчага героя з яе грамадзянскімі схільнасцямі, а не толькі маральнымі якасцямі можа садзейнічаць фарміраванню грамадзянскіх ідэалаў [2].

Безумоўна, вышэйсказанае найперш датычыць празаічных тэкстаў, аднак варта вычэрпваць і патэнцыял лірычных твораў. Так, перад вывучэннем тэмы "Літаратурная песня. А. Ставер", "Жураўлі на Палессе ляцяць" мэтазгодна актуалізаваць веды вучняў пра народную песню як сродак перадачы нацыянальнага каларыту ў побыце і культуры народа, для чаго прапануюцца праблемныя пытанні, што патрабуюць ад вучняў характарыстыкі беларуса як чалавека, аналізу ўмоў жыцця беларускага народа. Эфектыўнасць вывучэння верша Р. Барадуліна "Мы – беларусы" павысіць складанне схемы-акраслова "продкі", што ілюструе якасці беларускага характару. Кожная з назваў павінна пачынацца з літары, якая ўваходзіць у склад гэтага слова. Працуючы са схемай, вучні аналізуюць змест верша, прыводзяць прыклады з гісторыі, якія яскрава падкрэсліваюць адметнасць асобы беларуса, вылучаюць сродкі мастацкай выразнасці – даюць эстэтычную ацэнку феномена нацыянальнага характару.

Вывучаючы "Рэквіем па кожным чацвёртым" А. Вярцінскага, варта агучыць жыццёвае крэда паэта: "Для чалавека мала проста ненавідзець. Для чалавека мала проста любіць. Для чалавека мала быць проста сумленным і проста чалавечным. Чалавек яшчэ павінен адчуваць адказнасць за лёс іншых людзей, змагацца за агульныя інтарэсы і ідэалы". Задача вучняў – прасачыць адметнасць паэтычнага ўвасаблення аўтарскай думкі, бо кожная з прыведзеных пазіцый адлюстравана ў вершы. Эфектыўнай для фарміравання грамадзянскіх пачуццяў і эстэтычнага асэнсавання сацыяльнай бессмяротнасці чалавека будзе дзейнасць па ўстанаўленні гэтай адпаведнасці.

Такім чынам, аналіз навуковых крыніц і педагагічнага вопыту ў аспекце заяўленай праблемы дае падставы для наступных высноў: рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні ёсць патрабаванне часу; сярод ключавых кампетэнцый асобы на сучасным этапе вылучаюцца сацыяльна-грамадзянскія; яны могуць фарміравацца ўжо ў працэсе школьнай адукацыі, у т.л. літаратурнай, на аснове ведаў і уменняў, рэгламентаваных праграмамі па беларускай літаратуры для сярэдніх школ, з выкарыстаннем форм і метадаў, уласцівых працэсу грамадзянскай адукацыі [1].

**Літаратура**


1. Гражданское образование / Отв. ред. А.А. Михайлов, В.А. Дунаев. – Мн., 1999. – 94 с.
2. Мещерякова Н.Я., Гришина Л.Я. Формирование активной гражданской позиции учащихся на уроках литературы в 4–7 классах: Кн. для учителя.– М.: Просвещение, 1987.– 160 с.
3. Хуторской А. Ключевые компетенции как компонент личностно-ориентированной парадигмы образования // Народное образование. – 2003. – № 2. – С. 58–64.
4. Зимняя И.А. Ключевые компетенции – новая парадигма результата образования // Народное образование. – 2003. – № 5. – С. 34–41.


## ДА ЛІНГВІСТЫЧНАГА АНАЛІЗУ ПАЭТЫЧНАГА ТЭКСТУ


**М.А. Гулевіч**

Навуковы кіраўнік – В.М. Шавель, магістр педагагічных навук

УА "Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт", г. Баранавічы, Беларусь


Дзеля таго, каб пісьменнік адбыўся як нацыянальны мастак ў поўным сэнсе гэтага слова, мала паслугоўвацца словамі беларускай мовы. Трэба яшчэ быць арганічна ўрослым у нацыянальную традыцыю, ведаць і адчуваць родную культуру, яе традыцыі, гісторыю,